ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

25 кастрычніка 1931 г
№ 249 (1518)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК і МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Не паслабляць барацьбы за асеньня-зімовыя

Выяздная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" скончыла сваю работу на Аршанскім чыгуначным вузьле.

Сёньня яна дае справаздачу аб сваёй рабоце і тых выніках, якіх дасягнула аршанская комсамолія дзякуючы перабудове сваёй працы.

Завяршэньне трэцяга рашаючага году пяцігодкі, сканчэньне раду буйнейшых фабрык і заводаў ускладае на транспорт у час асеньня-зімовых перавозак асабліва вялікія і адказныя задачы.

З гэтымі задачамі транспорт зможа справіцца толькі пры ўмовах, калі будуць канчаткова ўжыты мэтоды бальшавіцкай работы, калі абязьлічка ў паравозным вагонным парку,ураўнілаўка ў сыстэме заработнай платы будуць канчаткова зьнішчаны.

Недарма пасьля гістарычнай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР на транспорце вызначыўся значны пералом, але старое кіраўніцтва НКЗ ня здолела яго замацаваць і працягваць барацьбу за далейшае аздараўленьне чыгуначнага транспорту.

Новае кіраўніцтва НКШЗ узяло рэзкі курс на тое, каб вывесьці транспорт з вузкага месца, якое ён займаў у агульным пасьпяховым соцыялістычным наступе. Загад наркома выклікаў вялікую хвалю творчага энтузіязму і жаданьня змагацца за бальшавіцкі транспорт. У гэтых умовах старая сыстэма работы транспортнага комсамолу не магла задаволіць новыя запатрабаваньні.

Насьпела патрэба ў карэннай перабудове работы: зрабіць яе больш гнуткай, больш опэрацыйнай, наблізіць да паравоза і дэпо.

Праца выязной рэдакцыі паказала, што пры першых кроках перабудовы комсамольскай работы ўжо адчуваецца палепшаньне ўсёй работы вузла. Комсамольская організацыя кожнага вузла—гэта баявы атрад рабочае клясы, які пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі паказвае прыклады ўдарнай работы.

Аршанская комсамолія пры перабудове сваёй работы паклала ў аснову барацьбу за пасьпяховае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак, за здаровы паравоз, супроць абязьлічанага вагона.

Дзякуючы гэроічнай працы комсамоліі і рабочай моладзі вузла былі сваячасова адпраўлены комсамольскія эшалёны бульбы Ленінграду, забясьпечана неадкладная адпраўка грузаў Магнітбуду.

Работа комсамольскай ячэйкі, перанесеная непасрэдна ў брыгаду, цалкам накіравана на тое, каб выканаць асноўныя вымернікі, папярэдзіць паўторны рамонт, надаць асеньня-зімовым перавозкам баявыя тэмпы.

Зараз комсамолія Гомельскага заводу Ланцуцкага ў парадку падрыхтоўкі да Кастрычнікавых сьвят рыхтуе звышплянава вагон. Кастрычнікавыя сьвяты і пленум ЦК КП(б)Б і КСМ павінны паслужыць фінішам барацьбы комсамолу на транспорце. К гэтым тэрмінам неабходна прынесьці дзесяткі гаспадарча-разрахунковых брыгад з тых 300, якія ЦК ЛКСМБ пастанавіў організаваць да Кастрычнікавых сьвят, прынесьці новыя спараныя брыгады і адрамантаваныя вагоны.

Прысуд над нямецкімі матросамі

БЭРЛІН. Сёньня надзвычайны суд у Кілі вынес прысуд па справе нямецкіх матросаў на нямецкіх параходах, быўшых у Ленінградзім парту. Частка качагараў парахода „Астра" абвінавачваецца ў тым, што адмовіліся падпарадкавацца загаду капітана прыступіць да працы, за што яны прыгаворваны да 2-х месяцаў турмы кожны.

... Пролетарская літаратура павінна дапамагчы партыі і комсамолу даць маладому пакаленьню напрамак у жыцьці... ... Работу з пісьменьнікам палепшыць, акружым пролетарскіх пісьменьнікаў яшчэ большым клопатам, будзем ім яшчэ больш дапамагаць у іх росьце... (Косараў)

ВЕЧАР КОМСАМОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ПРОГРАМА:

1. Пролетарская літаратура і барацьба за комсамольскую тэматыку—дакл. т. Ал. Кучар.

Пасьля дакладу—спрэчкі.

2. Выступленьні пролетарскіх комсамольскіх паэтаў і пісьменьнікаў: М. Чарот, А. Александровіч, Б. Броўка, В. Каваль, З. Піхадзеўскі, А. Кулямоў, М. Гарцман, Б. Мікуліч, З. Півавараў, С. Знаймы і інш.

Вечар адбудзецца 27 кастрычніка, а сёмай гадзіне ўвечары ў Доме Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25).

На вечар запрашаюцца комсамольскі актыў гораду і члены рабочых літгурткоў.

КОМСАМОЛЕЦ, МАЛАДЫ ЎДАРНІК!

Рыхтуйся да вечару. Яшчэ раз азнаёмся з творамі беларускай мастацкай літаратуры, з комсамольскай тэматыкай і прыходзь на вечар з конкрэтнай крытыкай, з конкрэтнай прапановай:

А. Александровіч. „Напор", „Вершы і поэмы". М. Чарот. „Сонечны паход". П. Галавач. „Спадох на загонах", „Віхаваты". П. Броўка „Цэхавыя будні", „Каландры". М. Лынькоў „Апошні зьверыядавец", „Андрэй лятун". В. Каваль „Ільска", „Жвіво". С. Ліхадзеўскі „Ровэсты дальней прыстані". Б. Мікуліч. „Удар", „Наша сонца" П. Трус „Дзесяты падмурак". Є. Знаймы „За дамбаю"

Менгарком ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена", ячэйка ЛКСМБ пры Доме пісьменьнікаў

Умець метка і быстра страляць

Пяцімільённы комсамол павінен даць краіне 5 мільёнаў дасканалых стралкоў

Выклік лепшых баўманскіх стралкоў падхоплены комсамоліяй БССР

IX зьезд УсеЛКСМ ясна вызначыў задачы комсамолу ў галіне ваенізацыі. Аднак, лепшыя баўманскія стралкі зьвярнуліся з запытаньнем да ўсёй комсамольскай організацыі Савецкага Саюзу: „Ці праўда, што дзесяткі тысяч комсамольцаў зусім ня могуць страляць, інакш кажучы—не гатовы да абароны, не гатовы да будучых жорсткіх клясавых боек"?

Побач з гэтым баўманцы высунулі цэлы рад практычных прапаноў у галіне барацьбы комсамолу за стралковае ўдасканаленьне саюзу.

На заклік баўманцаў горача адгукнуліся комсамольскія колектывы заводаў: Ланцуцкага, Варашылава і „Бальшавік"

Гэтыя колектывы поўнасьцю падтрымалі прапановы і ўзялі на сябе рад абавязкаў у вайсковай вучобе. Комсамольскія організацыі БССР павінны зараз-жа падхапіць выклік баўманскіх комсамольцаў і заводу імя Ланцуцкага аб падрыхтоўцы лепшых стралкоў.

Мішэнь Наркома—мэта нашай вучобы

Комсамольскі колектыў заводу імя Ланцуцкага вітае прапанову лепшых стралкоў комсамольцаў Баўманскага раёну аб правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу на лепшага стралка комсамольца.

У вайсковай працы комсамолу яшчэ шмат трэскучых фраз, трапаніны аб неабходнасьці аўладаць вайсковай тэхнікай, а конкрэтная работа па ваенізацыі знаходзіцца ў загоне. Яскравым прыкладам гэтага зьяўляецца вайсковая работа нашага колектыву.

Некалі на заводзе быў цір і стралковы гурток. Але зараз стралковы гурток разваліўся, з-за няўважлівасьці комсамольскага колектыву.

Ніколі не парушаецца цішыня ў заводзкім ціры. Мішэні без ніводнай дзірачкі ў той час, як комсамольскі колектыў мае ўсе магчымасьці організаваць стралковую вучобу. У колектыве ёсьць 6 комсамольцаў стралкоў 1-ае клясы. Але іх спрактыкаванасьць іх уменьне абараняцца ад ворага не перадаюцца астатняй масе комсамольцаў. Маса комсамольцаў колектыву, альбо зусім ня ўмее, альбо надзвычай дрэнна аўладае стрэльбай таму, што мы ня лічылі абавязкам забівацца, каб кожны комсамолец быў добрым стралком.

Вайсковы работнік нашага колектыву т. Каўфман, цэхавыя вайсковыя працаўнікі т. т. Чарно і Чукліс зусім ня ўмеюць страляць. А колькі дакладаў аб падрыхтоўцы да абароны краіны яны зрабілі на сходах комсамольскіх ячэек!

Комсамольскі колектыў зусім недастаткова ўдзяляе ўвагі (?) нічае ў працы Асоавіяхэмаўскай ячэйкі заводу.

Усесаюзны конкурс на лепшага стралка комсамольца павінен ускалыхнуць усю комсамолію і мобілізаваць яе на конкрэтную работу па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны, ўздымаючы баяздольнасьць кожнага комсамольца.

5-ці мільённы комсамол Савецкага Саюзу павінен даць 5 млн. добрых стралкоў.

Мы ўключаемся ў падрыхтоўку да конкурсу і выклікаем комсамольскую організацыю Беларусі прыйсьці да 1-га студзеня—пачатку конкурсу з узорамі добрай стральбы з рэвольвэра.

Мішэнь наркома павінна зьявіцца мэтай стралковай вучобы кожнага комсамольца:

У дэкадны тэрмін на заводзе імя Ланцуцкага організоўваецца стралковы маладзёжны гурток. Адказным за выкананьне гэтага зьяўляецца першаклясны стралок з заводу т. Супронаў. Організоўваецца комсамольскі пост у заводзкім ціры. Адказныя т. Глушакоў і т. Мурынаў.

Праверце затворы! У бой за добрага стралка комсамольца! Комсамолія заводу Ланцуцкага дасьць ударнікаў абароны.

Абавязуюся падрыхтаваць да конкурса 5 чалавек

Я, комсамолец заводу Ланцуцкага Супронаў, на стралковым спаборніцтве ў 1930 годзе пры стральбе з дробнакаліберкай вінтоўкі выбіў з 50 магчымых 49 ачкоў. За гэта я атрымаў катэгорыю стралка 1-ае клясы.

Першаклясныя стралкі Баўманскага раёну зусім правільна паставілі праз „Комсамольскую праўду" пытаньне аб падрыхтоўцы комсамольца-стралка. Наш колектыў абгаварыўшы гэта пытаньне, вітае прапанову стралкоў Баўманскага раёну і выклікае ўсю комсамолію Беларусі ўключыцца ў конкурс.

У парадку падрыхтоўкі да конкурсу комсамольскі колектыў вылучыў мяне адказным за організацыю маладзёжных стралковых гурткоў. Абавязваюся па-ўдарнаму выканаць гэтую працу. Асабіста я бяру на сябе абавязак падрыхтаваць да ўдзелу ў конкурсе 5 комсамольцаў нашага колектыву і выклікаю на соцспаборніцтва першаклясных стралкоў комсамольцаў нашага заводу:



сэкратара колектыву т. Сая, т. Саламонава і т. Глушакова.

Г. Супронаў

Горача адгукнуліся

Комсамольскі колектыў заводу „Бальшавік" горача адгукнуўся на адозву лепшых баўманскіх стралкоў (Масква). 23-га кастрычніка ва ўсіх цэхах, адбыліся мітынгі комсамольцаў сумесна з рабочай моладзьдзю. Комсамольцы 1-га хромавага цэху у сваёй рэзолюцыі пэынялі цэлы рад практычных мерапрыемстваў наконт палепшаньня аўладаньня тэхнікай і выклікалі на соцспаборніцтва комсамольцаў і рабочую моладзь 2-га хромавага цэху.

Комсамольцы 1-га хромавага цэху ўзялі на сябе абавязак рэгулярна наведваць вайсковы пункт, ахапіць усіх навічкоў вайсковым навучаньнем, добра аўладаць стралковай тэхнікай.

Комсамольцы жэлацінкага і мэханічнага цэхаў адгукнуліся на адозву ваенсэктару колектыву. Ячэйкі ратпачалі падрыхтоўку да стралковых спаборніцтваў.

Адозва баўманскіх стралкоў у гэты дзень была надрукавана ў штодзёнцы.

Комсамольскі колектыў выклікае на соцспаборніцтва комсамольцаў абутковай фабрыкі ў лепшым ажыцьцяўленьні адозвы баўманскіх стралкоў.

Пост „ЧЗ"
Кутман

Варашылаўцы рэалізуюць заклік баўманцаў

9 зьезд УсеЛКСМ вызначыў цэлы рад баявых задач у галіне вайсковай работы комсамолу. На гэтым-жа зьезьдзе генэральны сэкратар ЦК УсеЛКСМ тав. Косараў сказаў: Кожны малады рабочы, кожны працоўны павінен навучыцца аўладаць вінтоўкай, кулямётам, павінен ведаць пабудову сваёй арміі, павінен умець удзельнічаць і перамагаць у бойцы.

Імпэрыялістыя ўсіх краін вядуць шалёную падрыхтоўку вайны супроць бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту—Савецкага саюзу.

Комсамольскі колектыў заводу імя Варашылава, прачытаўшы заклік баўманскіх комсамольцаў, вітае гэтую ініцыятыву і ўхваляе прапанову організаваць 1-га студзеня 1932 году конкурс на лепшага стралка-комсамольца.

Бюро комсамольскага колектыву высунула цэлы рад мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтай прапановы:

1. Організаваць конкурс на лепшага стралка заводу;

2. на цэхавых сходах комсамольскіх ячэек паставіць пытаньне аб конкурсе, вывесіць лёзунгі плякаты на тэму вайсковай абароны;

3. У сувязі з конкурсам у вучпункце разгортваць соцспаборніцтва між паасобнымі цэхавымі ячэйкамі.

Заводзкая шматтыражка „Чырвоны молат" у комсамольскай старонцы будзе весьці паказ лепшых комсамольскіх стралкоў і цэхавых ячэек у іх падрыхтоўцы да конкурсу.

Комсамольцы і цэх'ячэйкі, якія пакажуць узоры сапраўды ударнай работы, будуць прэміяваны.

Брыгада „Чырвонай зьмены"
Фішкін, Гурэвіч

Узьняць вытворчую зацікаўленасьць колгасьнікаў

Разьмеркаваньнем прыбыткаў па працаднёх заахвоцім к ударнай працы, рашуча ўдарым па недысцыплінаванасьці і гультаёх

Сёньнешні матар'ял з месц падае рад прыкладаў агідных адносін да колгаснай вытворчасьці, ускрывае злачынныя адносіны кіраўнікоў да колгаснай гаспадаркі і маемасьці.

Безгаспадарчасьць, абязьлічка, адсутнасьць працдысцыпліны, зьдзельшчыны, дакладнага ўліку і соцыялістычных мэтадаў працы—вось характарыстыка работы некаторых колгасаў, якія працуюць на авось і ня хочуць уразумець, што ад організацыі гаспадарчай працы залежыць посьпех і росквіт усіх галін колгаснай вытворчасьці (колгасы „Чырвоная зьмена“, і „Новае жыцьцё“—Пухавіцкі раён, „Чырвонае вока“—Лепельскі „Сьвятлан“—Смалявіцкі раён).

Колгасныя і комсамольскія ячэйкі павінны безадкладна, разам з усёю колгаснаю масай, разгарнуць шырокую барацьбу за організацыю колгаснай вытворчасьці, умацаваньне гаспадаркі,—бо гэтыя задачы зьяўляюцца зараз цэнтральнымі, галоўнейшымі задачамі колгаснага руху.

Комсамольцы павінны быць перадавікамі

Колгас „Чырвоная Зьмена—адзін з буйнейшых колгасаў Пухавіцкага раёну. На сёньня гэты колгас мае цэлы рад буйных прарываў, галоўным чынам, у выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній.

Дзякуючы несваячасовай падрыхтоўцы, 30 га сена засталіся няпрыбранымі, тады як колгас адчувае вялікі недахоп кармоў. 20 цялят з-за дрэннага догляду прызнаны нягоднымі для гадоўлі, штодня прападае па 2-3 цялят. Асеньняя сяўба зацягнута. На 10 кастрычніка яшчэ не засеяна каля 15 га, што складае 40 проц. пляну. Уборку бульбы не пачыналі.

Зьдзельшчына яшчэ ня ўжываецца. Працоўныя кніжкі выдадзены колгасьнікам толькі для формы. Уліку не вядзецца, працадні ніколі не запісваюцца.

Трэба ў корані перабудаваць усю работу комсамолу колгасу у адпаведна з задачамі гаспадарча-організацыйнага замацаваньня колгасаў. Ш.

Сыгналы яшчэ не пачуты

Ужо ня раз на старонках „Ч. З.“ пісалася аб неабходнасьці аздаравіць колгас „Чырвонае вока“ Зацеклянскага сельсавету, Лепельскага р-ну. Што-ж мы бачым там зараз?

Працоўная дысцыпліна не ў пашане, зьдзельшчына ня ўведзена. 2 га сенажаці засталіся наўбраныя, хлявы для жывёлы ня будуюцца. Шмат бульбы зазімуе на полі, бо абагуленую бульбу ніхто ня хоча выбіраць.

Комсамольскай ячэйцы трэба, нарэшце, прачнуцца і зьнішчыць недахопы, якія маюць месца у колгаснай працы і па сёньня.

Казлоўскі.

Дабіць абязьлічку і самацёк

У саўгасе № 53 (г. Бел. Горкі), які зьяўляецца буйнай жывёлагадоўчай гаспадаркай, пануе паўнейшая безгаспадарчасьць, абязьлічка, самацёк. Прамфінплян хранічна ня выконваецца. Сотні розных сельгасмашын раскіданы па ўсёй тэрыторыі саўгасу, і псуюцца пад адкрытым небам.

150 га вікі засталося на полі. Віка, складзеная ў копы, таксама гніе. 50 проц. бручкі і буракоў папсавалася, сіласаваньне кармоў не закончана.

Укомплектаваньне гурту праходзіць зусім дрэнна, жывёла ня мае ніякага прытулку і стаіць пад адкрытым небам, бо будаўніцтва ў саўгасе праводзіцца чарапашымі тэмпамі. Ня лепш справа з будаўніцтвам дамоў пад кватэры для рабочых.

Зьдзельшчына ва ўсе зьвеньні гаспадарчай работы яшчэ ня ўведзена.

Умовы жыцьця саўгасных рабочых вельмі дрэнныя. Сталоўкі няма Продуктамі харчаваньня рабочыя забясьпечваюцца ненормальна, зарплата выдаецца несваячасова.

Ня блюдуць у саўгасе працоўнай дысцыпліны. Соцспаборніцтва, ўдарніцтва ня ужываецца. Ня уведзены яшчэ гаспадарчы разрахунак, не расстаўлена правільна рабочая сіла, не наладжан сталы ўлік працы. Наглядаецца вялікая цякучасьць рабочай сілы. Дырэкцыя саўгасу ня лічыць патрэбным займацца організаваным наборам рабочае сілы.

Партыйная і комсамольская ячэйкі павінны безадкладна прыняць рашучыя захады па зьнішчэньню гэтых хваробных зьявішчаў у працы саўгасу і аддаць свае сілы на яго гаспадарча-організацыйнае ўмацаваньне.

Каранкевіч М.

Даць бой безгаспадарчасьці

У колгасе „Новае жыцьцё“ Балоцкага сельсавету Пухавіцкага р-ну зьвіла сабе гняздо безгаспадарчасьць. Увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар параскіданы—машыны псуюцца на дажджы.

Шмат аўса пагніло на полі, лубін і грэчка ня зьвезены. Дысцыпліна адсутнічае, на працу выходзяць колгасьнікі калі хто хоча. Шмат колгасьнікаў за 9 месяцаў адпрацавала толькі 30 дзён.

Комсамольская ячэйка колгасу яшчэ не зьяўляецца актыўным удзельнікам ва ўсёй гаспадарчай працы і барацьбітом за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасу.

Не чакаючы ні хвіліны ячэйка павінна перабудаваць сваю работу і накіраваць усе сілы на організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне.

Кавалёк.

Не дапусьцім псаваць інвэнтар

У колгасах „Чырвоная Беларусь“ „10 Кастрычнік“ і ў саўгасе Палажэвічы Стара-Дарескага раёну на ляжаецца вялізарнейшая безгаспадарчасьць. Сельгасмашыны і прылады стаяць пад адкрытым небам, ад чаго псуюцца і выбываюць са строю.

Комсамольскія ячэйкі, замест упартай барацьбы з такімі фактамі абыходзяць іх моўчкі.

Ячэйкі не павінны быць наглядальнікамі агідных спраў, а актыўнымі барацьбітамі за лепшую пастаноўку работы ў цэхах колгаснай вытворчасьці.

В. Сулімчык.

Ачысьціць колгас ад чужакоў

Колгас „Сьвятлан“ Драчкаўскага сельсавету Смалявіцкага р-ну значна адстае ў выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. „Сьвятлан“ мае жывёлагадоўчы ўхіл, але спадзяючыся на авось, не заклаў ніводнае тоны сілосу.

Хлявы на зіму не ацеплены, жывёла стаіць у халодных, брудных памяшканьнях. Пад азімыя культуры ніводзін гектар яшчэ не ўзараны. Бульба ня выбрана. Зьдзельшчына ў колгасе ня ўведзена, няма дысцыпліны. Колгасьнікі выходзяць на працу а 10-11 гадзіне. Ударніцтва і соцспаборніцтва не практыкуецца, не вядзецца сталага ўліку працы

Чатыры гектары аўса засталіся на полі нязжатыя, тры вазы ячменю згніла на полі.

Разьмеркаваньне прыбыткаў праведзена няправільна. Атрымалася так, што хто рабіў менш, той атрымаў больш. У колгас пралезьлі клясава-варожыя элемэнты, якія падрываюць усю гаспадарчую працу і стараюцца разваліць яго. Саевіч Міхась — былы афіцэр, Шчарбак Саўка—абкладзены цьвёрдым заданьнем, уступіў у колгас толькі дзеля таго, каб не раскулачылі, Парфенчык Кірыла, Талака Сымон—царкоўныя служкі, якія падрываюць працу колгасу.

Партыйная і комсамольская ячэйкі не зьвяртаюць ніякай увагі на такое становішча колгасу, чым аб'ектыўна спрыяюць падрыву яго работы.

З 1929 году ў колгас ўліліся ўсяго дзьве гаспадаркі. Безадкладна трэба аздаравіць колгас, асаблівую ўвагу зьвярнуўшы на яго організацыйна-гаспадарчае замацаваньне, бо гэта зараз аснова ўсяго колгаснага руху.

Верас.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе работы па папярэднім разьмеркаваньні даходаў у колгасах за 1931 г.

Бюро ЦК КП(б)Б прызнае работу па папярэдняму разьмеркаваньню даходаў у колгасах нездавальняючай. Рад нізавых і раённых партарганізацый, а таксама і колгасных органаў не надалі гэтай кампаніі важнага палітычнага значэньня, як важнейшаму зьвяну у арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні колгасаў і не забясьпечылі кампаніі штодзённым партыйным кіраўніцтвам.

У выніку гэтага існуюць адносіны да разьмеркаваньня даходаў, як да чыста тэхнічнай бухгалтарскай справы і кампанія па разьмеркаваньню даходаў падстаўлена фактычна самацёку. Работа па разьмеркаваньню даходаў праходзіць абсалютна нездавальняючымі тэмпамі. На становішча на 1 кастрычніка толькі 75 проц. колгасаў зрабілі падлік працадзён, 40 пр. колгасаў падлічылі ўраджай і прыбыткі, 60 проц. колгасаў падлічылі выданыя авансы колгасьнікам і менш 10 проц. колгасаў зрабілі прыкладнае разьмеркаваньне даходаў і ураджаю.

Рад колгасаў і нават пасобных раёнаў дапусьцілі грубейшыя скажэньні асноўных прынцыпаў зьдзельшчыны і устаноўленага парадку разьмеркаваньня даходаў і ураджаю ў колгасах. Гэтыя скажэньні заключаюцца, галоўным чынам у наступным:

а) У большасьці раёнаў пры выдачы натуральных авансаў—жыта, бульба і інш.—рад колгасаў пад уплывам кулацкай агітацыі ўтаравалі разьмеркаваньне не па працаднях на аснове зьдзельшчыны, а па едаках, дварох, сем'ях, устанаўлена пайковыя нормы выдачы (Гарадоцкі, Магілёўскі, Мазырскі, Вушацкі, Крычаўскі і інш. раёны).

б) Большасьць раёнаў яшчэ зусім не пачалі работы па популярызацыі вынікаў папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у лепшых колгасах як сярод колгасьнікаў, так і сярод аднаасобнікаў, чым карыстаецца кулак і яго агенты для барацьбы супроць колгаснага руху.

ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе райпарторганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на кіраўніцтва работай па разьмеркаваньні даходаў у колгасах, і даўшы гэтай кампаніі важнае палітычнае значэньне. Неабходна забясьпечыць своечасовае разьмеркаваньне даходаў у колгасах па працы, што павінна замацаваць зьдзельшчыну, як новую, больш высокую форму колгаснай працы, і актывізаваць асноўную масу колгасьнікаў на барацьбу за ўсямернае ўмацаваньне свайго колектыўнага гаспадаркі.

ЦК адзначае, што праведзеньне правільнага разьмеркаваньня даходаў у колгасах на асновах колькасьці і якасьці затрачанай працы, будзе выклікаць супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў і іх агентуры ў колгасах. Кулацтва імкнецца сарваць разьмеркаваньне даходаў па працаднёх і будзе усялякімі способамі тармазіць праведзеньне гэтай кампаніі. Партыйныя організацыі павінны згрупаваць і актывізаваць масы колгасьнікаў пад лёзунгам разьмеркаваньня даходаў па працы, супроць імкненьняў кулака і яго агентуры сказіць асноўныя прынцыпы разьмеркаваньня даходаў.

Партыйнае кіраўніцтва кампаніяй па разьмеркаваньні даходаў павінна быць конкрэтным і опэрацыйным. Неабходна разгарнуць масавую растлумачальную работу, шырока популярызаваць вынікі папярэдняга разьмеркаваньня даходаў сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў з тым, каб паказаць на радзе фактаў перавагу буйнай колектыўнай гаспадаркі. Разьмеркаваньне даходаў трэба правесьці так, каб лепшыя працаўнікі ў колгасах атрымалі сапраўды лепшую долю даходаў і каб колгасьнікі, якія адлыньваюць ад працы адчувалі ў разьмеркаваньні даходаў атрымаўшы меншую долю. Такім чынам кампанія па разьмеркаваньні даходаў павінна зьвязацца з кампаніяй па ўмацаваньні зьдзельшчыны і асабліва выхаваньня асабліва адсталай часткі колгасьнікаў.

ЦК пастанаўляе:

1. Абавязаць РК КП(б)Б і Прэзыдыум РВК на кожным чарговым пасяджэньні заслухоўваць даклады Колгасаў, МТС, партыйных ячэяк, сельсаветаў і асобных кіраўнікоў колгасаў аб ходзе работы па разьмеркаваньню даходаў у колгасах.

2. Даручыць РК КП(б)Б для аказаньня раённай дапамогі колгасам і кіраўніцтва у справе разьмеркаваньня даходаў прымацаваць да груп 5-10 колгасаў ні менш аднаго партыйнага работніка, усклаўшы на іх адказнасьць за вынікі разьмеркаваньня даходаў прымацаваных колгасаў.

3. Адзначаючы рад выпадкаў, калі выяжджаючыя ў колгасы раённыя работнікі, замест дапамогі колгасам у разьмеркаваньні даходаў, ўносяць блытаніну і скажэньні асноўных прынцыпаў у гэтай справе, даручыць РК КП(б)Б правесьці спэцыяльныя курсы, для вывучэньня прынцыпаў і тэхнікі разьмеркаваньня з тым, каб у далейшым у колгасы накіраваць толькі падрыхтаваных работнікаў, добра разумеючых прынцыпы, тэхніку і палітычнае значэньне разьмеркаваньня даходаў.

4. Абавязаць Колгасцэнтр БССР зрабіць прыкладнае разьмеркаваньне ў спэцыялізаваных колгасах, популярызаваўшы парадак і вынікі разьмеркаваньня ў гэтых колгасах шляхам выданьня спэцыяльных брошур, лістовак, плякатаў і асьвятленьня у перыядычным друку.

5. Даручыць рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт штодзённа асьвятляць ход работы па разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у колгасах, популярызаваць вынікі лепшых колгасаў, организаваць сыстэматычную кансультацыю па пытаньнях тэхнікі разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў. Абавязаць Белдзяржвыдавецтва да 1 лістапада выдаць ня менш 5 брошур па пытаньню разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у колгасах.

6. Лічыць неабходным пасылку студэнтаў колгаснай школы і студэнтаў II, альбо апошняга курсу аднаго з сельска-гаспадарчых ВНУ для дапамогі раённым організацыям у праведзеньні разьмеркаваньня ўраджаю.

7. Абавязаць ЦК ЛКСМБ і ЦСПС разам з Колгасцэнтрам БССР, організаваць пасылку брыгад у раёны найбольш адстаючыя ў разьмеркаваньні ураджаю і маючыя вялікую колькасьць колгасаў.

8. 21 кастрычніка г. г. на Сэкратарыяце ЦК заслухаць даклады Койдзінаўскага і Заслаўскага РК КП(б)Б аб разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у колгасах гэтых раёнаў.

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены“

Дамо ільнавалакно дзяржаве

Дрыса. 20 Агульны стан уборкі і апрацоўкі лёну ў раёне наступны: колгасны і індывідуальны сэктар увесь лён выцерабіў, у саўгасах заканчваецца церабленьне.

Па раёне лён у большасьці знаходзіцца ў адмочцы і алдежцы. Ільнатрасту апрацоўвае Дрысенскі ільнаапрацоўчы завод, які значна перавыконвае плян.

Па раёне працуюць 84 ільнамяльныя пункты, рыхтуюцца да пуску два ільна-апрацоўчых заводы —Бігосава і Боркавічы. На 15 кастрычніка па раёне загатоўлена ільнатрасты 7,9 проц. гадовага заданьня,

Пры спрыяючых кліматычных умовах у бліжэйшыя дні паступленьне ільнатрасты з адлежкі значна павысіцца.

Комсамольцы Дрысенскага раёну мобілізуюцца на організацыю чырвоных абозаў ільнавалакна імя 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі 19 кастрычніка брыгады выехалі ў сельсаветы раёну.

Шульга В.

Усе сілы на апрацоўку лёну

Колгасы Крупскага раёну амаль не пачынаюць апрацоўкі лёну. Колгасьнікі спадзяюцца, што лён апрацуюць ільназаводы, якія маюцца ў раёне, забываючыся, што Хацюхоўскі ільназавад яшчэ не скончан і будзе пушчан у ход першага студзеня 1932 г.

Комсамольская ячэйка і райком комсамолу бязьдзейнічаюць. Райком яшчэ ня даў дырэктывы ячэйкам КСМ аб першапачатковай апрацоўцы лёну.

Колгасы Узнацкага, Грыцкавіцкага, Хацюхоўскага сельсаветаў не апрацавалі ніводнага кілё лёну. Комсамольскія ячэйкі (Траякоўская, Якімаўская, Узнацкая і Хацюхоўская) не ліквідуюць гэтых ганебных прарываў. Алексёнак Янка.

Зрываюць апрацоўку

Слуцак. У колгасе „Чырвоны маяк № 1“ 160 коп абмалочанага лёну ляжыць пад адкрытым небам. Абмалочаны лён не намочан. Зьдзельшчына ўведзена фармальна, запіс працадзён у працоўныя кніжкі праводзіцца раз у месяц.

Хрон.

Спыніць зьдзекі над сьвіньнямі

У колгасе „Пераможца“ Рагачоўскага раёну каля 100 галоў сьвіннога гурту. Догляду за свіньнямі няма ніякага. сьвінарніках брудна, холадна і цёмна, пачалі будаваць новы сьвінарнік, але канчаць думаюць на той год.

Комсамольскія ячэйкі колгасаў і саўгасаў павінны напружыць усе сілы і дабіцца, каб як найхутчэй закончыць будаўніцтва сьвінарнікаў і палепшыць догляд сьвіней.

З. Я. Каліна.

Рыхтавацца да ўсебеларускай конфэрэнцыі школ ФЗВ

Транспорт патрабуе работы па-новаму

АГНЯЦЬВЕТ

Ударнай спаранай брыгадзе

Сьпевы колаў звонкія і гучныя.
Успамінае жыва машыністы
Тыя дні,
калі хварэў, сумуючы.
Паравоз шумлівы,
галасісты.
Кожны раз забруджаны,
устрывожаны,
прабягаў кіпучыя
вакзалы.
Часта ён спазьняўся,
ня выходзіў,—
І прагулы ранамі зіялі...
Дні былі, як і заўсёды
быстрыя.
Дый аднойчы, раніцаю хмарнай,
Хутка падышоў
да машыністага
Станцыённы,
радасны начальнік.
— „Справа ёсьць!
З 15-га лютага
Пачынаем спаранай яздою
Штурмаваць
прагулы нашы лютыя,
Недахопы, п'янкі і прастоі!"

Прывітаньнем
вочы засьмяяліся.
Ён пайшоў.
работа забурліла.
І брыгада баявых ударнікаў
Паравозу аднаўляла сілы.
* * *
Даёш здаровы паравоз!
Рамонт
наладзім гаспадарскі!
Цягнік,
напоўнены жыцьцём,
Вядзе да фабрык
і колгасаў!
Нядбайцы сёньня пераможаны,
Напружнай стальлю
зьзяюць рэйкі.
У працы—
бурнасьць маладзёжная
і комсамольская ячэйка!
Бяжы, цягнік!
Ўсьміхайся іскрамі!
Нясі гартаваную радасьць!
Шырэй
дарогу бальшавіцкую
Ударнай, спаранай брыгадзе!

Выязная рэдакцыя скончыла сваю работу

Барацьба за ударны транспорт ня скончана

Уся работа выязной рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" на Аршанскім вузьле праходзіла пад знакам падрыхтоўкі да пленуму ЦК КПбБ, на якім будзе абгаворана пытаньне аб стане чыгуначнага транспорту да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі і аб бязумоўным выкананьні загадаў тав. Андрэева.

Уся работа была прасякнута практычным ажыцьцяўленьнем шасьці ўказаньняў тав. Сталіна.

Выязная рэдакцыя правяла сходы па цэхох. Рабочыя высоўвалі сустрэчныя прапановы і самаабавязкі. Такія-ж сходы былі праведзены па ўсіх цэхавых комсамольскіх ячэйках.

У выніку ўдалося ўхапіцца за асноўныя, вядучыя зьвеньні, ад якіх залежыць пасьпяховае правядзеньне перавозак. За гэтыя асноўныя зьвеньні, за конкрэтныя мерапрыемствы па вырашэньню асноўных задач выступіла комсамолія вузла.

Устаноўленыя комсамольскія сыгнальныя пасты па ўсім вузьле сочаць за рухам асеньня-зімовых грузаў, высьвятляюць усе непаладкі і перашкоды, на якія адразу-ж рэагуюць і дамагаюцца іх зьнішчэньня.

Дыспэтчар адыгрывае вялікую ролю ў справе нормальнага руху цягнікоў і выкананьня вымернікаў. Сыгнальны пост пры дыспэтчэру таксама вядзе нагляд за правільным ходам асеньня-зімовых грузаў па лініі.

Сіламі комсамольцаў, і рабочай моладзі ў падарунак пленуму ЦК КП(б)Б і 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі адрамантаваны звыш пляну тры паравозы.

Гаспадарчаму разрахунку была аддана асаблівая ўвага. 9 ударных маладзёжных і комсамольскіх брыгад пераведзены на гаспадарчы разрахунак. На будаўніцтве організаваны дзьве ўдарныя маладзёжныя брыгады, якія сваімі сіламі выкапалі вялікі катлаван для фабрыкі-кухні і канчаюць пабудову раней тэрміну.

Організаваны дзьве ўдарныя комсамольскія кандуктарскія брыгады.

Вялікая ўвага зьвернута на рамонт вагонаў. Пасьля загаду тав. Андрэева была організавана ўдарная комсамольская брыгада па рамонту вагонаў, а таксама ўстаноўлены кантрольныя пасты над выкананьнем загаду тав. Андрэева.

За час працы брыгады выходзіла штодзёнка „За работу па-новаму".

Зараз комсамольскі колектыў у асноўным акомсамолены. У асноўным заканчваецца перабудова комсамольскай работы: організоўваюцца ячэйкі пры ўсіх брыгадах.

Уся работа адбывалася пад кіраўніцтвам партыйнай організацыі вузла, РК комсамолу і колектыву цягі.

Задача зараз у тым, каб замацаваць пачатую работу і прыйсьці да пленуму ЦК КП(б)Б з яшчэ большымі посьпехамі. Г. Фіялкін

Менск ператварыць ва ўзорную соцыялістычную сталіцу

Пабудуем фабрыку-кухню для соцыялістычнай сталіцы—Менску

Мы ўключыліся ў пераклічку сямі савецкіх сталіц.

Мы абавязаліся організаваць комсамол і рабочую моладзь БССР ва ўдарную колёну па соцыялістычнай перабудове Менску—сталіцы Савецкай Беларусі.

Менск неабходна ператварыць ва ўзорную соцыялістычную сталіцу.

Комсамолія Менску павінна зараз-жа ўзяцца за соцыялістычную перабудову сталіцы, мобілізавацца на выкананьне плянаў комунальнага будаўніцтва, вылучыць ударныя комсамольскія брыгады на адказныя вучасткі будаўніцтва комунальнай гаспадаркі.

Барацьба за пабудову ў Менску фабрыкі-кухні—адна з вялікіх спраў комсамолу і рабочай моладзі ў соцыялістычнай перабудове сталіцы БССР.

ЛКСМБ і рабочая моладзь павінны поўнасьцю забясьпечыць няўхільнае выкананьне пастановы СНК і ЦК КП(б)Б аб комунальнай гаспадарцы БССР.

18-га кастрычніка адбылася гаспадарча-тэхнічная нарада па будаўніцтву фабрыкі-кухні ў Менску. У рабоце нарады прынялі актыўны ўдзел комсамольцы пабудовы.

Нарада пастанавіла пачаць работу з 19-га кастрычніка г. году. Ухвалена распачаць кладку сьцен над вытворчую частку, апалубачныя работы, гнуцьцё арматуры з жалеза якое зараз падрыхтавана да работ. Акрамя гэтага, паскорыць вырабку перапл ётаў, падрыхтоўку гравія, каб пачаць выкладку фэрмы пад халадзільнікам, забэтонаваць этажэрку і інш.

Надзвычай складаны мантаж унутранага абсталяваньня. Прыблізна неабходна будзе ўстанавіць звыш 52 мотораў.

Усё гэта прымушае зацікаўленыя ў будаўніцтве організацыі наладзіць справу так, каб поўнасьцю забясьпечыць бесьперабойную падачу будаўнічых матар'ялаў, інструманту і рабсілы і інш.

На месцы пабудовы ёсьць матар'ялы, якіх хопіць толькі распачаць будаўніцтва. Яшчэ не наладжана бесьперабойная дастаўка неабходных для далейшага разгортваньня будаўніцтва матар'ялаў. Ствараецца пагроза ў тым, што калі будуць скончаны апалубачныя работы, ня хопіць жалеза для арматуры, апалубку прыдзецца разьбіраць, бо псуецца пад дажджом і сьнегам. Таксама і з астатнімі відамі работ. Нерэгулярная дастаўка матар'ялаў будзе зрываць усе віды работ па пабудове фабрыкі-кухні.

Зараз неабходна, выходзячы з плянавых меркаваньняў і рэсурсаў, распачаць падвозку ўсіх відаў матар'ялаў. Бюро камітэту Белдзяржбуду неабходна зараз-жа заняцца пытаньнем забясьпечаньня пабудовы фабрыкі-кухні неабходнымі матар'яламі і рабсілай.

Лепшыя комсамольцы-ударнікі, арматуршчыкі, цесьляры, бэтоншчыкі і монтажнікі павінны пайсьці на пабудову фабрыкі-кухні для соцыялістычнай сталіцы БССР—Менску.

Крычаўскі

Вопыт Масквы—Менску

Са старое дарэволюцыйнае Масквы з яе тупікамі, вузкімі, крывымі вуліцамі, якія вымашчаны каменьнем—Масква соцыялістычная шпарка на хаду перабудоўваецца, зьмяняе з кожным днём свой твар.

33 віднейшых спэцыялістых прыцягнуты да распрацоўкі асноўных заданьняў, да складаньня пляну рэконструкцыі старое і будаўніцтва новае Масквы.

Проэкты павінны быць закончаны да студзеня 1932 г.

Новая Масква будзе мець палац Саветаў—красу і гонар соцыялістычнага будаўніцтва.

Масква будзе мець такую энэргетычную гаспадарку, якая задаволіць ня толькі сьветлавыя, але і палiўныя патрэбы гораду.

З Масквы будуць хадзіць параходы на Адэсу. Шлях пройдзе праз Дзясну і Дняпро, праз тэрыторыю Беларускае ССР.

Бальшавікі прымусяць Аку ўпадаць у Маскву-Раку.

Гэта ў будучым. Зусім у недалёкім будучым.

Няўжо зараз Масква не перабудоўваецца.

Вазьмеце—Ахотны: Выраслі цэлыя прысады насаджэньняў, выпрастана трамвайная лінія. Ахотны заліты асфальтам. Яго ранейшыя вузкія тротуары ператвораны ў шырокія зручныя панэлі. Там, дзе штурхаліся спэкулянты і прадаўцы, сёньня пакладзены першы камень будучага грандыёзнага будынку—гасьцініцы Мосавету.


Вазьмеце адну з ударных вуліц. Любую: Арбат, Цьвярскую, Электразаводзкую і г. д.

Кожная мае рад дасягненьняў ня толькі ў афарбоўцы дамоў, абзеляненьні і чыстаце. На гэтых вуліцах пасьля ўзбуйненьня, кожны жакт пачынае займацца ператварэньнем жыльля ў соцыялістычныя парасткі новага быту.

Гэта ў асяродку. Ускраіны таксама зьмянілі свой твар. Яны асьветлены і часткова асфальтаваны. Там, дзе былі гнілыя домікі, дзе былі асноўныя гнёзды рабочых кватэр—там стаяць высокія, прыгожыя шматпавярховыя, поўныя сьвятла каменныя дамы. Гэта—рабочыя кватэры. Яны эдбудаваны па апошняму слову навукі і тэхнікі. Яны стандарты для шматлікіх гарадоў.

Нават у далёкім Таджыкістане пачалі будаваць па гэтаму ўзору рабочыя кватэры. З-за адсутнасьці месца мы ўжо не ўспамінаем аб рэконструкцыі заводаў-гігантаў: АМО, ДЫНАМО і інш. А пабудова такіх гігантаў соцыялістычнай будоўлі, як Шарыкападшыпнікбуд, Калібр і інш.

Бязумоўна, мы яшчэ шмат у чым адстаем. Узрослыя запатрабаваньні 3-х мільённага насельніцтва Масквы не задавальняюцца поўнасьцю дасягненьнямі, якія маюцца ў наяўнасьці ў галіне рэконструкцыі



комунальнай гаспадаркі. Аднак, яны відавочны. І сталіцам, якія выкліканы на вялікую пераклічку соцыялістычнай рэконструкцыі ёсьць чаму павучыцца ў Масквы.

Часткова ў справе брукаваньня вуліц клінкерам і брушчаткай. У справе афарбоўкі, рамонту і будаўніцтва дамоў, мастоў, палепшаньня гарадзкога транспорту, стварэньня парку Культуры і адпачынку, стварэньня стадыёну —шмат ужо перанята Менскам у выглядзе вопыту ад Масквы.


Вялікаму пачыну ў сэнсе пераняcеньня маскоўскага вопыту па рэконструкцыі комунальнай гаспадаркі ў астатнія нацыянальныя сталіцы павінны садзейнічаць і штодзённая барацьба газэты—„Чырвоная Зьмена" за выкананьне прамфінпляну комунальнай гаспадаркі, барацьба за чыстату вуліц, рабочых дамоў, за абзеляненьне, за парадак, чыстату на вакзале, у трамваі, у цэху, у кватэры, барацьба за соцыялістычную культуру, барацьба за прабязі быту. Такую барацьбу зараз па-бальшавіцку вядзе „Вечерняя Москва". Пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу яна ўцягвае ў масавыя рэйды і ўдарныя брыгады рабкораўскія брыгады, комсамольцаў і рабочую моладзь, на справе вядучы барацьбу за масавую праверку выкананьня рашэньняў чэрваньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Выязная рэдакцыя „Вечерней Москвы"—Сэйфі.

Комсамольская організацыя Беларусі мае значныя посьпехі ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для шпарка растучай прамысловасьці БССР. Мы дабіліся значнага пашырэньня сеткі школ ФЗВ у агульнай сыстэме ўстаноў па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, па ўсіх спэцыяльнасьцях.

Аднак, дасягненьні, якія мы маем у галіне барацьбы комсамольскай організацыі за ФЗВ, нас ня могуць задаволіць.

У 3-м рашаючым годзе пяцігодкі ўступаюць у строй новыя фабрыкі і заводы. Да ўсёй комсамольскай організацыі цяпер прад'яўляюцца павышаныя запатрабаваньні. Падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў праз існуючую сетку ФЗВ трэба значна форсаваць. Організацыя



Фабзавучнікі за працай

новых школ ФЗВ—асноўная задача комсамолії. Гэтую задачу комсамол Беларусі выканае з гонарам.

Аб'яўлены ўсебеларускі конкурс на лепшую школу ФЗВ і ўсебеларуская конфэрэнцыя, якая адбудзецца ў бліжэйшы час, павінны даць значнае палепшаньне акадэмічна-вытворчага навучаньня ў школах ФЗВ і ўзьняць грамадзка-палітычнае выхаваньне вучняў на ўзровень новых задач, высунутых новымі абставінамі соцыялістычнага будаўніцтва.

За час, які застаўся да конфэрэнцыі, комсамольскія організацыі на аснове самаправеркі ўдзелу ў працы ФЗВ павінны практычна дапамагчы ў палепшаньні якасьці падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў.

Менская гарадзкая організацыя комсамолу зрабіла першы крок, уключыўшыся ў правядзеньне конкурсу на лепшую пастаноўку працы школ ФЗВ. Комсамольскія ячэйкі і камітэты абавязаны удзяліць максімум увагі штодзённаму палепшаньню працы ФЗВ.

Каб лепш падрыхтавацца да ўсебеларускай конфэрэнцыі, Гарком разам з Гарпрофсаветам 10-XI праводзіць гарадзкую конфэрэнцыю ФЗВ. Конфэрэнцыя і час да конфэрэнцыі павінна зьявіцца адпраўным пунктам у мобілізацыі усёй увагі комсамольскай організацыі Менску на вузлавыя пытаньні якаснага палепшаньня працы школ ФЗВ, а менавіта—палепшаньне тэорэтычна-вытворчага навучаньня і павышэньне грамадзкай політычна-выхаваўчай працы вучняў.

На вырашэньне пастаўленых задач комсамольскія ячэйкі павінны ўдзяліць максімум увагі. Ад гэтага залежыць уся праца комсамольскай організацыі ў галіне падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў.

Па прыкладу менскай комсамолії комсамольскія організацыі павінны ўключыцца ў конкурс на лепшую школу ФЗВ, на лепшы ўдзел комсамольскай ячэйкі ў палепшаньні працы школ ФЗВ.

Час, які застаўся да ўсебеларускага зьезду, павінен быць экзаменам комсамольскай організацыі ў яе барацьбе за кваліфікаваныя кадры, у барацьбе за пашырэньне сеткі ФЗВ і за якасьць навучаньня ў іх.

Уключайцеся ў конкурс!

Рыхтуйцеся да конфэрэнцыі!

Піонэрскую энэргію—у правады пяцігодкі

Дапамагчы трэцяй зьмене яшчэ больш павысіць свой удзел у соцыялістычным будаўніцтве

Актыўна працуюць на вытворчасьці

Піонэрбаза заводу „Бальшавік" штодзённа прымае актыўны ўдзел у выкананьні прамфінпляну,

Піонэрбрыгады штодзенна бываюць на заводзе, правяраюць выкананьне прамфінпляну паасобных брыгад і ударнікаў.

У час абедзеных перапынкаў право зяць гутаркі з бацькамі аб выкананьні прамфінпляну.

23 кастрычніка піонэр-брыгада працавала у рамачным аддзяленьні першага хромавага цэху. Брыгада адбірала бракаваныя цьвікі, сартавала добрыя і дрэнныя калодкі. выпраўляла нягодныя цьвікі і г. д. Гэтым піонэры дапамагалі гаспадарча-разрахунковай брыгадзе рамшчыкаў з'эконміць матар'ял.

Акрамя гэтага, піонэры актыўна ўдзельнічаюць у рабоце штодзённак: зьбіраюць матар'ялы, перапісваюць іх. Зараз піонэры ўключыліся ў фінплян-эстафэту і вярбуюць рабочых у ашчадкасу.

Кутман.

Сабралі 25 прапаноў

Піонэр-атрад Дубровенскай яўрэйскай сямігодкі прымацаваны да матальнага цэху Дубровенскай мануфактурнай фабрыкі. Піонэры штотыдзень бываюць у цэху і дапамагаюць рабочым у выкананьні прамфінпляну.

За кароткі час сабрана 25 рабочых прапаноў па рацыяналізацыі вытворчасьці і палепшаньні быту. У цэху разьвешаны лёзунгі аб політэхнізацыі. Піонэры дапамагаюць фабрычным організацыям выяўляць прагульшчыкаў, гультаёў.

Коньнікаў, Пэўзьнэр

„Баяцца павадыра, як агню"

Піонэрская організацыя шклозаводу „Комінтэрн" не ажыцьцяўляе рашэньняў другога ўсебеларускага зьлёту піонэраў. Піонэры не адрываюць бацьком у выкананьні прамфінпляну, іх наогул не адчуваецца на вытворчасьці.

Дзялянцтва, дыктатарства і адміністрацыйнасьць—вось пры дапамове якіх методаў кіруюць піонэратрадамі на заводзе.

Важаты піонэр-базы Вачэра С. імкнецца ўстанавіць вайсковую дысцыпліну ў атрадах. Піонэры баяцца свайго павадыра, як агню.

Комсамольскі колектыў зусім не кіруе працай піонэр-атраду. Сакратар колектыву гаворыць: „Для нашай піонэр-організацыі гэта карысна". Бабруйскі РБ ДКА не ўмее кіраваць на дзейны Вачэры, які давёў атрады да развалу.

Брыгадзір „ЧЗ" Розэнгауз.

Піонэрклюб ператварылі ў хлеў

На шклозаводзе „Ноўка" Сураскага раёну опортуністычна недаацэньваюць піонэр-організацыю. Чатыры піонэратрады заводу зусім не працуюць.

Невядома нават калі адбываліся піонэрскія сходы і работа зьвеньняў.

Калісьці піонэры мелі свой клюб, але зараз комсамольскі колектыў забраў яго. Сакратар колектыву пасьмеціў там усе плякаты, забраў абсталяваньне (сталы, лаўкі). клюб ператварыўся ў хлеў і ўвесь час знаходзіцца на замку.

Піонэратрады не прыцягваюцца да ўдзелу ў гаспадарча-політычных кампаніях, да выкананьня прамфінпляну заводам.

Трэба раз на заўсёды пакончыць з опортуністычнай недаацэнкай піонэр-атраду. Каненчык Я.



Піонэры на стрэльбішчы

Навічкі з піонэраў дрэнна замацоўваюцца

Піонэр-базы г. Віцебску дапамагаюць комсамолу ў ператварэньні яго у шматмільённую організацыю. Так, піонэр-база фабрыкі „Профінтэрн" перадала у комсамол 20 лепшых піонэраў—дзяцей рабочых. Піонэр база швейнай фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі" перавяла 32 піонэры, піонэрбаза „Лекерта" 20, база „Чырвонага Мэталісту"—30.

Але трэба засьведчыць, што камітэты і колектывы комсамолу дрэнна кіруюць навічкамі, якія прыйшлі з піонэрразраду. Па большасьці вышэйпералічаных колектываў піонэры ня ўцягнуты ў політгурткі, вясну вучобу і г. д.

Юнкор „ЧЗ" Узьбярэжны.

Забясьпечыць сталае кіраўніцтва

Ляцерыскі піонэр-атрад напярадзені развалу. Ні ячэйка, ні РБ ДКА не дапамагаюць яму ў працы. Вылучаны на працу ў якасьці важатага комсамолец Паўловіч ніякай работы з піонэрамі не праводзіць.

Брыгада „Ч. З." Васіль і Рыгор

Папаўняйце рады культарміі

> 1 мая 1932 г. Савецкая Беларусь павінна стаць краінай суцэльнай пісьменнасьці

Стварайце ўдарныя брыгады культармейцаў імя XIV гадавіны Кастрычніка

Савецкая Беларусь 1-га мая 1932 году будзе ператворана ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Ліквідацыя няпісьменнасьці— адна з асноўных задач культурнай рэволюцыі. Усялякая опортуністычная недаацэнка ліквідацыі няпісьменнасьці, усялякая павольнасьць і нядбайнасьць у яе ажыцьцяўленьні павінны атрымліваць сакрушальныя ўдары.

Ліквідацыю няпісьменнасьці—на павестку дня кожнай комсамольскай ячэйкі. Кожная комсамольская ячэйка павінна праверыць свой удзел у барацьбе за краіну суцэльнай пісьменнасьці, мобілізаваць самыя шырокія масы комсамольцаў і ўсёй працоўнай моладзі ў рады культармейцаў.

Трэба шырока популярызаваць прыклад менскіх ударнікаў культармейцаў імя 14 гадавіны Кастрычніка, падхапіць і распаўсюдзіць на ўсю комсамолію і масы настаўніцтва іх ініцыятыву

Кастрычнікаўскі абавязак менскіх культармейцаў

У мэтах выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці сярод рабочых і абвяшчэньню гораду Менску ў суцэльна-пісьменны да XIV гадавіны Вялікага Кастрычніка, мы культармейцы, фабзаўкамскія, організатары лікбезу, комсамольцы, асьветнікі зьлёту абвяшчаем сябе ударнікамі культурнага фронту імя XIV гадавіны Вялікага Кастрычніка і абавязваемся перад партыйнымі, савецкімі, профсаюзнымі організацыямі і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці гэты пачэсны баявы абавязак выканаць па-ленінскаму, па-бальшавіцку.

Мы заклікаем рабочых, членаў профсаюзаў, комсамольцаў вучняў, асьветнікаў, навуковых працаўнікоў, інжынэраў, тэхнікаў, майстроў і пісьменнае працоўнае насельніцтва ўліцца і наладзіць нашы шэрагі барацьбітоў за суцэльна-пісьменны Менск у падарунак XIV гадавіне Кастрычніка.

Наш баявы плян працы:

— Выявіць і насадзіць за вучобу ўсіх няпісьменных рабочых і сяброў профсаюзу да 50 год і астатняе працоўнае насельніцтва да 45 год і малапісьменных рабочых да 35 год

— Дабіцца [illegible] наведваньня няпісьменнымі і малапісьменнымі заняткаў;

— Увесьці на ўсіх лікпунктах тэх. і палітгадзіны,

— Дабіцца заключэньня соц. дагавароў паміж няпісьменнымі і малапісьменнымі, а таксама паміж лікпунктамі, школамі і г. д.;

— Няпісьменных, ліквідаваўшых сваю няпісьменнасьць пераводзіць у школы для малапісьменных;

— Ход працы асьвятляць у друку цэнтральных, шматтыражках, насьценгазэтах.

Выклікаем паспаборнічаць нашаму прыкладу **Гомель, Магілеў, Бабруйск, Барысаў і Віцебск.**

Лепшых ударнікі вытворчасьці, у бой за выкананьне плану ліквідацыі няпісьменнасьці.

Брусілоўская, Глухоўская, Пікус, Рамановіч, Бітавіч, Кандрычын, Багушэвіч, Лебедзеў і інш.

Комсамольцаў-культармейцаў ня відно

Ліквідацыя няпісьменнасьці у Стара-Дароскім раёне пад пагрозай зрыву. Далёка не ва ўсіх сельсаветах працуюць лікпункты і школы малапісьменных. У Шчыткаўскім і Дражненскім сельсаветах ні сельсаветы ні настаўнікі гэтай справай не займаюцца, між тым у гэтых сельсаветах маецца каля 800 чалавек няпісьменных.

Ніякай растлумачальнай работы пра задачы культурнай рэволюцыі і ліквідацыі няпісьменнасьці не праводзіцца. Большасьць культармейцаў бязьдзейнічае.

У большасьці выпадкаў сельсаветы і партыйныя ячэйкі не цікавяцца і не кіруюць разгортваньнем ліквідацыі няпісьменнасьці.

Комсамольская організацыя раёну ня ўдзельнічае ў вырашэньні задач ліквідацыі няпісьменнасьці. Ячэйкі не цікавяцца працай лікпунктаў.

Райком ЛКСМБ павінен неадкладна мобілізаваць комсамолію раёна на штурм задач культурнай рэволюцыі, уцягнуць шырокія масы комсамольцаў у рады культармейцаў.

М. Мацько, П. Харытанов

Опортуністычны вецер вее...

Лікпункты, якія знаходзяцца на тэрыторыі Шарпунскага сельсавету, (Заслаўскі раён) не працуюць. Ліквідатары нядбайна адносяцца да сваёй работы. Комсамольская ячэйка выпусьціла з кругу дзеяньня пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці.

С. Бальшавіцкі.

Не прытупляйце самую вострую, самую моцную зброю партыі

Комсамол Случчыны, Копыльшчыны і Бялыніншчыны павінен узмацніць кіраўніцтва юнкор-рухам і працай насьценгазэт

Ня раз ужо сыгналізавалі мы аб тым, што ў Слуцкім, Капыльскім, Бялыніцкім раёнах дагэтуль не разпрацаваны пастановы другога зьезду рабсельваенкораў.

Аднак, сыгналы нашы не пачуты. Зьмешчаны сёньня матар'ял аб гэтым яскрава гаворыць.

Важнейшыя пастановы партыі і зьезду рабсельваенкораў павінны быць паложаны ў аснову кіраўніцтва юнкоррухам.

Слуцкі РК ЛКСМ ня кіруе юнкоррухам

Кіраўніцтвам і разгортваньнем працы сярод юнкораў Слуцкі РК КСМ не цікавіцца. Ні разу на бюро РК ня выпрацоўваліся мерапрыемствы для правядзеньня ў жыцьцё пастаноў партыі аб перабудове юнкорруху.

Пастановы другога зьезду рабсельваенкораў як па колгасных, так і гарадзкіх ячэйках Случчыны яшчэ не прапрацаваны.

Удзел комсамольцаў у працы нізавога друку не адчуваецца.

Безадкладна патрэбен рашучы пералом. Каго сьлед трэба ўдарыць за недаацэнку гэтай важнейшай галіны працы.

Брыгада „Ч. З."
Новік Я. і Вяроўка Т.

Пастановы зьезду павінны быць выкананы

Пастановы партыі і другога зьезду рабсельваенкораў аб організацыі „у кожным колгасе, саўгасе МТС у час уборачнай і пасеўнай кампаній насьценгазэты" у Бялыніцкім раёне ня выканаваны. Партыйныя і комсамольскія організацыі зусім ня цікавяцца гэтым пытаньнем. У шмат у якіх колгасах няма насьценгазэт. У Неткаўскім сельсавеце насьценгазэта не аднаўлялася з першага мая.

Ніякай працы з рабселькорамі не праводзіцца. Раённая шматтыражка „Чырвоны колектывіст" так сама недаацэньвае гэтага важнейшага пытаньня.

Група комсамольцаў-селькораў

Даць кіраўніцтва насьценгазэтам

„Чырвоная Зьмена" ўжо некалькі раз пісала аб тым, што ў Капыльскім раёне не вядзецца ніякай працы сярод рабсельюнкораў. няма ніякай дапамогі і кіраўніцтва ў працы насьценгазэт.

Такое становішча існуе і зараз. Партыйныя і комсамольскія організацыі раёну дагэтуль не разгарнулі масавай прапрацоўкі пастаноў партыі і зьезду рабселваенкораў. Раённая газэта „Колгасьнік Капыльшчыны" таксама не паклапацілася заняцца гэтым пытаньнем.

Насьценгазэты комбінату, колгасаў „Барацьбіт № 2", „Іскры Ільіча" Варашылава і інш. зусім не працуюць. Рэдколегіі сьпяць непрабудным сном. На зьмешчаныя допісы ніхто не рэагуе.

Салагуб

Разгарнуць масавую работу

Рашэньні партыі і другога зьезду рабсельваенкораў аб перабудове рабселькораўскай работы не праводзяцца ў жыцьцё Менскім Белпэдтэхнікумам.

Партыйная і комсамольская організацыі не вядуць ніякай працы сярод студкораў. Студкоры зусім слаба ўдзельнічаюць у працы насьценгазэты „Малады асьветнік". З пачатку заняткаў газэта яшчэ ні разу ня вышла.

Комсамольцы дагэтуль добра не ўяўляюць сабе, што такое сталінская пуцёўка. На агульным сходзе зрабілі аб ёй толькі маленькую інформацыю і ўхвалілі дэталёва прапрацаваць пуцёўку. На распрацоўку, замест 50 комсамольцаў 2 курсу зьяўляецца 10-12 чалавек.

Комсамольскі колектыў „прапануе" выпусьціць насьценгазэту, замест разгарнуць працу сярод юнкораў і праверыць, як выконваецца яго пастанова.

У пытаньнях разгортваньня студкораўскага руху і хутчэйшай рэалізацыі сталінскай пуцёўкі, колектыў спадзяецца на самацёк.

Комсамольскаму колектыву зараз-жа неабходна пераключыцца на ўдарнае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў менскага агульна-гарадзкога зьлёту юнкораў, г. зн.—узяцца за рэалізацыю рашэньняў другога зьезду рабсельваенкораў і сталінскай пуцёўкі, намеціўшы дзеля гэтага конкрэтныя мерапрыемствы ва ўмовах тэхнікуму.

П. К.

З фронту політвучобы

Праводзім агрополітбой

Ня ўсе ячэйкі Брагінскага раёну пачалі вучобу, хаця райком комсамолу своечасова забясьпечыў школы падручнікамі, пісьмовымі прыладамі, програмамі і кіраўнікамі. Паасобныя сэкратары ячэек опортуністычна адносяцца да марксысцка-ленінскага выхаваньня. Скліканыя два разы курсы па падрыхтоўцы пропагандыстых сарваліся толькі з-за таго, што ня прыбылі людзі.

Для праверкі стану політвучобы ў нашым раёне праводзім зараз агрополітбой. Выпрацавана і разаслана па ячэйках памятка.

Зіна.

У чаканьні дырэктыў...

Прапрацоўка сталінскай пуцёўкі сярод комсамольцаў Шклоўскага ільназаводу не разгорнута. А ў гэты час, з-за няведаньня машын, з-за адсутнасьці пэўнай кваліфікацыі на заводзе ламаюцца машыны і бываюць вялікія прастоі.

Шклоўскі райком комсамолу ніякіх указаньняў у галіне рэалізацыі пуцёўкі ячэйкам ня даў.

Загорскі.

Топчацца на месцы

Сімаоўская ячэйка Талочынскага р-ну на чале з сэкратаром Ждановічам недапушчальна ігнаруе рашэньні IX зьезду аб барацьбе за шматмільённы. Ячэйка, як да МЮД'у так і пасьля, ня вырасла ні на аднаго чалавека,

Ячэйка ня выканала таксама рашэньне комсамольскага зьезду аб пагалоўным уцягненьні комсамольцаў у колгасы. Палова комсамольцаў па-за колгасамі. Ня лепш справа з політадукацыяй і вайсковай работай.

Матыль.

25-X-31 г. а 7-й гадз. увеч. у памяшканьні Гаркому КСМ адбудзецца нарада ўсіх комсамольскіх організатараў мобілізацыі сродкаў.

Абвестка дня:

1. Аб ходзе фінэстафэты

Яўка ўсіх—пад асабістую адказнасьць сакратароў яч. ЛКСМБ.

Менгарком ЛКСМБ

Нам. адказ. рэдактара С. АНІСАЎ

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.